МИНСК, ЦК КП(б)Б, сектор печати
„Сов. Радз.“ — 2 экз.

Орган Бабруйскага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных

# Совецкая Радзіма

№ 75 (102)
АЎТОРАК 8 МАЯ 1945 г.
Цана 20 кап.

## Множыць поспехі сельскай гаспадаркі

Поўныя радасці і шчасця дні перажывае наша краіна. Гераічная Чырвоная Армія поўнасцю авалодала і высока ўзняла сцяг нашай перамогі над цэнтрам нямецкага імперыялізма і нямецкай агрэсіі, сталіцай фашысцкага логава Берлінам. „Цяпер нашы пабеданосныя войскі громяць узброеныя сілы праціўніка ў цэнтры Германіі, далёка за Берлінам, на рацэ Эльба“ (І. Сталін).

Прышло вялікае свята на нашу вуліцу! Гістарычная перамога заваявана цітанічнымі намаганнямі нашага совецкага народа і нашай слаўнай Чырвонай Арміі. Для заваявання гэтай перамогі совецкі народ, Чырвоная Армія аддавалі і аддаюць усе свае сілы і намаганні.

Працаўнікі совецкага тыла, не шкадуючы ні сіл, ні часу, самаахвярна працуюць на сваіх пастах, дапамагаючы Чырвонай Арміі ў выкананні яе вялікай вызваленчай місіі. Поспехі воінаў - франтавікоў натхняюць байцоў совецкага тыла на працоўныя подвігі. Яркім сведчаннем усямернай дапамогі фронту з'яўляецца паспяховае правядзенне вясенне-палявых работ калгаснікамі нашай абласці. Разам з усім калгасным сялянствам нашай краіны калгаснікі абласці змагаюцца за ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы, за атрыманне высокага ўраджаю, каб даць краіне і фронту больш прадавольства і сыравіны.

Сёння мы друкуем паведамленне аб выдатных поспехах на калгасных палях нашай абласці. Уключыўшыся ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва, калгасы абласці выканалі план сяўбы ранніх зерневых на 100,1 процанта. Калектывы машынна-трактарных станцый, ідучы плячо к пляччу з калгаснікамі, выканалі дзяржаўны план веснавых палявых работ на 100,6 процанта. Баявыя перамогі воінаў фронта пераклікаюцца з поспехамі воінаў тыла.

Перамагаючы ўсе цяжкасці на сваім шляху, калгаснае сялянства не пакладаючы рук працуе на сваёй вытворчасці. За час вясенне-палявых работ выраслі дзесяткі, сотні герояў—воінаў соцыялістычніх палёў. На ўсю рэспубліку сталі вядомы імёны знатных трактарыстаў Цімкавіцкай МТС Васіля Лобана і Васіля Сакалоўскага. Гэта яны сваёй гераічнай працай на 15-сільным трактары ўзаралі 389 гектараў. Выканалі гадавую норму і зэканомілі 1.405 кілаграмаў гаручага. Трактарысты гэтай МТС Ольга Верабей і Пётр Талкач узаралі 226 гектараў і зэканомілі 875 кілаграмаў гаручага. Машынна-трактарныя станцыі раёна дапамаглі калгасам Капыльшчыны быць у ліку перадавых па заканчэнню веснавой сяўбы.

Калгасніца сельскагаспадарчай арцелі імені Варашылава, Старадарожскага раёна, Ольга Шаранда ў адказ на слаўныя перамогі Чырвонай Арміі дала рэкордную норму выпрацоўкі на ворыве. За дзень парай коней яна ўзарала 1,73 гектара. Больш чым па аднаму гектару ўзорваў за дзень калгаснік—араты сельгасарцелі «Пражэктар», Слуцкага раёна, Андрэй Берасневіч. Іх, перадавікоў сельскай гаспадаркі, многа, якія вялі за сабой калгаснае сялянства і кавалі перамогу на калгасных палях.

У ліку перадавых—Копыльскі, Грэскі, Слуцкі, Старадарожскі, Парыцкі раёны, якія паспяхова закончылі сяўбу ранніх зерневых культур.

Прыклад з перадавых павінны браць усе раёны абласці. Нам неабходна ў бліжэйшыя 2-3 дні закончыць сяўбу ва ўсіх раёнах, ва ўсіх калгасах. Множыць поспехі сельскай гаспадаркі—гэта значыць падцягваць адстаючых да ўзроўня перадавых, дабівацца агульнага ўздыму. Такая неадкладная задача партыйных і совецкіх арганізацый!

## На канферэнцыі ў Сан-Францыска

САН-ФРАНЦЫСКА, 3 мая. (Спец. кар. ТАСС). У той час, як чатыры камісіі канферэнцыі займаюцца арганізацыйнай работай, лідэры канферэнцыі прадаўжаюць раіцца, імкнучыся дасягнуць магчыма большага пагаднення ў адносінах паправак, прапануемых у праграме Думбартон-Окса. В. М. Молатаў, Стэтыніус, Ідэн і Сун Цзы-вень раіліся сёння. Адбудзецца таксама сустрэча прадстаўнікоў дэлегацый Совецкага Саюза, Злучаных Штатаў, Злучанага Каралеўства, Кітая і Францыі, каб прадоўжыць абмеркаванне праблемы апекі.

## Ад Совецкага Інформбюро

### Аператыўная зводка за 6 мая

Войскі 2-га **Беларускага** фронта, прадаўжаючы наступленне, фарсіравалі праліў **Штральзундэрфарвасер**, занялі на востраве **Руген** гарады **Берген, Гарц, Путбус, Заснітц** і 6 мая поўнасцю авалодалі востравам **Руген**. У баях за 5 мая войскі фронта ўзялі ў палон 4660 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі 24 самалёты і 215 палявых гармат. У ліку палонных начальнік мабілізацыйнага аддзела Штэцінскага ваеннага округа контр-адмірал Хорстан.

Войскі 1-га **Беларускага** фронта, прасоўваючыся ўперад на паўночны захад і захад ад горада **Брандэнбург**, занялі буйныя населеныя пункты **Зандау, Вулкау, Клітц, Ферхель, Фірытц, Шлагенцін, Плауе, Грос-Вустэрвітц, Кадэ, Кароу**. За 5 мая, войскі фронта ўзялі ў палон 17120 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі 119 самалётаў і 235 палявых гармат.

Войскі 4-га **Украінскага** фронта, наступаючы на захад і паўднёвы захад ад горада **Марауска Острава**, з баямі занялі гарады **Беніш, Штэрнберг, Пржыбор, Новы Нічын, Фрэнштат, Валаш Межэрычы, Голешоу**. У баях за 5 мая войскі фронта ўзялі ў палон больш 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 2-га **Украінскага** фронта на паўночны ўсход ад горада **Брно** з баямі занялі горад **Коецін** і буйныя населеныя пункты **Фрыштан, Марцініцэ, Гулін**.

На іншых участках фронта—істотных змен не было.

## Удары авіяцыі Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота па караблях і транспартах праціўніка

3 і 4 мая авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота нанесла ўдары па караблях і транспартах немцаў у Балтыйскім моры на поўнач ад **Свінемюндэ**. У выніку гэтых удараў патоплены: вучэбны лінкор «Шлезіен» водазмяшчэннем 13600 тон і 5 транспартаў агульным водазмяшчэннем 24500 тон.

## Закончылі сяўбу ранніх каласавых

Калгасы Бабруйскай абласці 4 мая выканалі план сяўбы ранніх каласавых на 100,1 процанта.

Перадавыя раёны абласці—Копыльскі, Грэскі, Слуцкі, Старадарожскі, Парыцкі—засеялі сотні гектараў звыш плана. На калгасных палях ужо зелянеюць дружныя ўсходы аўса і ячменю.

## Выканан план веснавых трактарных работ

Уключыўшыся ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва, МТС Бабруйскай абласці 4 мая выканала дзяржаўны план веснавых трактарных работ на 100,6 процанта.

Перадавыя МТС — Цімкавіцкая, Грэская, Слуцкая—выканалі план на 170 процантаў.

Лепшых паказчыкаў дабіліся трактарысты Цімкавіцкай МТС—тт. Лобан і Сакалоўскі і брыгадзір трактарнай брыгады Слуцкай МТС тав. Шчэрбачэня.

## Сход, прысвечаны Дню большэвіцкага друку

У Бабруйскім Доме Чырвонай Арміі адбыўся сход партыйнага, совецкага і гаспадарчага актыва, прысвечаны Дню большэвіцкага друку.

Пад бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты ў пачотны прэзідыум выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным. Прысутныя стоячы доўга апладыруюць пры ўпамінанні імя таварыша Сталіна. У пачотны прэзідыум таксама выбіраецца Старшыня Совета Народных Камісараў БССР тав. Панамарэнка.

З дакладам аб Дню большэвіцкага друку выступіў рэдактар абласной газеты „Совецкая Радзіма“ тав. Бутрымовіч.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Выступіўшыя на сходзе лектар гаркома партыі тав. Сяргейчык, парторг ЦК КП(б)Б на лесакамбінаце тав. Крыжнёў і др. адзначылі, што абласная газета побач з некаторымі дасягненнямі ў рабоце мае таксама і недахопы. Газета слаба асвятляе работу школ, абаронна-фізкультурную работу, недастаткова арганізавана перадача вопыта стаханаўскай працы. Выступаўшыя таварышы ўдзялілі шмат увагі рабоце нізавога друку.

Удзельнікі схода з вялікім уздымам і натхненнем паслалі прывітальнае пісьмо арганізатару большэвіцкага друку Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Маршалу Совецкага Саюза таварышу Сталіну.

## Мітынгі і дэманстрацыі ў Францыі па поваду ўзяцця Берліна Чырвонай Арміяй

ПАРЫЖ, 6 мая. (ТАСС). Па выпадку ўзяцця Берліна Чырвонай Арміяй у Парыжы, Ліоне, Марселе і ва многіх другіх гарадах Францыі адбыліся шматлюдныя дэманстрацыі. У Перпіньяне пад урачысты звон усіх калакалоў горада сабралася 20-тысячная дэманстрацыя. Дэманстрацыя закончылася мітынгам, на якім удзельнікі віталі Чырвоную Армію і Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Сталіна. Дэманстрацыі адбыліся таксама ў Німе, Тарбе, Сэнт-Эцьене, Туры і ва многіх другіх гарадах.

